# Прэс–канфэрэнцыя ў БГКТ

У пятніцу 8 лютага 1996 г. у сядзібе БГКТ у Беластоку адбылася прэс–канфэрэнцыя, скліканая Галоўным праўленьнем гэтай арганізацыі.

Прэс–канфэрэнцыя была арганізаваная для польскамоўных журналістаў з нагоды юбілею — 40–годзьдзя БГКТ. Таму ня буду пісаць пра тое, што чытачам “Нівы” добра вядома. Спынюся толькі на некалькіх цікавых выказваньнях лідэраў БГКТ.

Паколькі прэса любіць справы незвычайныя, няўмольна выплывае справа канфлікту паміж беларускімі арганізацыямі. Старшыня ГП БГКТ Янка Сычэўскі панаракаў на атакі з боку новых арганізацыяў, “абкіданьне”, “стварaньне фактаў” і “злую волю” рэдактараў. Тым ня менш на настойлівыя намаганьні журналіста “*Gazety Wyborczej*” М. Халадоўскага, які вельмі хацеў пачуць, што існуе канфлікт, Я. Сычэўскі адказаў, што няма канфлікту, хаця асяродзьдзе пасваранае. Па–польску гучала гэта нават мякчэй: *poróżnione*.

Запытаны, чаму БГКТ не ўзяло голасу ў справе рэфэрэндуму аб дзяржаўнай мове і сымболіцы Рэспублікі Беларусь, Я. Сычэўскі заявіў, што БГКТ не бярэ голасу ў справах палітычных. Згаданая справа вельмі далікатная. Крытыка нацыі — гэта непаразуменьне. Трэба шукаць вытокаў цяперашняга становішча. Стан сьвядомасьці беларусаў — гэта раўнадзейная таго, што рабіла зь імі Польшча і Расея, і таго, што па сёньняшні дзень зь імі рабілася.

На пытаньне, чаму ўсё–такі ў сядзібе БГКТ вісіць “Пагоня”, Я. Сычэўскі адказаў, што гэты герб захоўвае сваю культурна–нацыянальную каштоўнасьць.

Разышліся пазыцыі дзеячоў БГКТ наконт асыміляцыі беларусаў у Польшчы. Уладзімер Юзьвюк лічыць, што С. Яновіч і Л. Тарасэвіч у нядаўняй тэлеперадачы перабольшылі праблему. Не пагадзіўся зь ім Я. Сычэўскі, які падкрэсьліў, што галоўнай прычынай таго, што маладыя людзі хаваюць сваю нацыянальнасьць, зьяўляецца неталерантнасьць з боку польскае большасьці.

Вельмі цікавы быў адказ Я. Сычэўскага на пытаньне, чаго БГКТ чакае ад новага прэм’ер–міністра В. Цімашэвіча*. Старшыня сьцьвердзіў, што ня надта на штось спадзяецца, бо раней выразных формаў дапамогі з боку В. Цімашэвіча, нягледзячы на ягоныя дэкларацыі, не было. Выняткам была толькі ініцыятыва правядзеньня нарадаў з Ваяводзкай управай у справе нацыяналізацыі Беларускага музэю ў Гайнаўцы. Не было дапамогі ў іншых справах, зь якімі зьвярталася да В. Цімашэвіча БГКТ. Тым часам хаця б мэдыяцыя ў справе арэнднай платы за сядзібу БГКТ з Гарадзкой управай Беластоку была б сур’ёзнай дапамогай.

Старшыня падкрэсьліў, што БГКТ чакае толькі, каб на ўзроўні дзяржавы і самаўраду як БГКТ, так і беларуская меншасьць былі трактаваныя дэмакратычна.

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1996. 25 лютага. № 8. С. 5.

* Уладзімеж Цімашэвіч быў прэм’ер–міністрам Польшчы з 7 лютага 1996 г. па 31 кастрычніка 1997 г. — **Рэд.**